# АСНОЎНЫЯ КІРУНКІ АРГАНІЗАЦЫІ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ АДОРАНЫХ ДЗЯЦЕЙ І ПАДЛЕТКАЎ

*В. У. Рагачова,*
дацэнт кафедры педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

Сучаснае развіццё грамадства высунула на першы план задачы ўмацавання пазіцый асобасна-арыентаванай педагогікі, якая прадугледжвае стварэнне спрыяльных умоў для самаразвіцця кожнага дзіцяці. Відавочна, што развіццё і выхаванне адораных, таленавітых дзяцей вырашае надзённую задачу фарміравання творчага патэнцыялу грамадства, забяспечвае магчымасці інтэнсіўнага сацыяльнага і навукова-тэхнічнага прагрэсу, далейшага развіцця навукі і культуры, усіх абласцей вытворчасці і сацыяльнага жыцця. У сувязі з гэтым працэс выяўлення, навучання і выхавання адораных і таленавітых дзяцей, навучэнцаў, студэнтаў сёння складае адно з вызначальных напрамкаў удасканалення сістэмы адукацыі і выхавання ў Рэспубліцы Беларусь.

Вывучэнне пытанняў адоранасці, арганізацыя працы з адоранымі дзецьмі і стварэнне адпаведных адукацыйна-выхаваўчых сістэм характарызуюцца існаваннем айчыннага і замежнага вопыту, прадстаўленага тэарэтычнымі і практычнымі распрацоўкамі, якія рэалізуюцца ў вучэбна-выхаваўчых і дасугавых установах рэспублікі. Да іх можна аднесці:

а) сістэму дашкольных установ, у першую чаргу дзіцячых садоў агульнаразвіццёвага выгляду; цэнтры развіцця дзіцяці, у якіх створаны найбольш спрыяльныя ўмовы для фарміравання здольнасцей дашкольнікаў, а таксама навучальныя ўстановы для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту, якія забяспечваюць пераемнасць асяроддзя і метадаў развіцця дзяцей пры пераходзе ў школу;

б) сістэму агульнаадукацыйных школ, у рамках якіх ствараюцца ўмовы для індывідуалізацыі навучання адораных дзяцей;

в) сістэму дадатковай адукацыі, якая накіравана на задавальненне зменлівых індывідуальных сацыякультурных патрэбаў адораных дзяцей і якая дазваляе забяспечыць выяўленне, падтрымку і развіццё іх здольнасцей;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

г) сістэму спецыяльных школ, накіраваную на працу з адоранымі дзецьмі (у тым ліку ліцэі, гімназіі і т.п.) і закліканыя забяспечыць падтрымку і развіццё магчымасцей такіх дзяцей у працэсе атрымання агульнай сярэдняй адукацыі.

Нягледзячы на тое, што ў рэспубліцы створана рознаўзроўневая сістэма ўстаноў па рабоце з адоранай моладдзю і дзецьмі, дзейнасць па іх выяўленні, выхаванні і развіцці не забяспечана на неабходным узроўні канкрэтным зместам педагагічнай дзейнасці і сучаснымі тэхналогіямі і методыкамі. У гэтым кантэксце актуальным будзе зварот да магчымасцей сацыяльна-культурнай дзейнасці. З'яўляючыся дзейнасцю, накіраванай на стварэнне ўмоў для найбольш поўнага развіцця, самасцвярджэння і самарэалізацыі адораных дзяцей, яна ўключае ў сябе рашэнне разнастайных праблем, звязаных з развіццём таленавітай асобы. Важнасць сацыяльна-культурнай дзейнасці ў тым, што гэта не проста арганізацыя вольнага часу, а арганізацыя ў сацыяльна значных мэтах: сацыяльная адаптацыя, задавальненне і развіццё культурных патрэб і інтарэсаў як асобнай асобы, так і соцыуму ў цэлым [1, с. 45–46].

Не менш важным лічыцца і тое, што сацыяльна-культурная дзейнасць аб'ектыўна валодае самарэлізацыйным, творчым патэнцыялам, можа выступаць як рэсурс працоўнай матывацыі, бо ажыццяўляецца ў вольны час, які з'яўляецца наймацнейшым матыватарам з нагоды сваёй нерэгламентаванасці, суб'ектыўнай прывабнасці, камунікатыўнай прыроды. Ва ўмовах вольнага часу адораныя дзеці маюць магчымасць трапіць у сацыяльна-псіхалагічную сітуацыю, максімальна спрыяльную для самарэалізацыі іх творчых патэнцый, якія не ўдаецца выявіць у звычайнай вучэбнай дзейнасці.

Дзеля развіцця сваіх талентаў адораныя дзеці павінны свабодна распараджацца часам і прасторай, вучыцца па пашыраным вучэбным плане і адчуваць індывідуальны клопат і ўвагу з боку свайго настаўніка ці кіраўніка. Шырокія часавыя рамкі на карысць развіцця праблемна-пошукавага аспекту. Акцэнт робіцца не на тое, што трэба знайсці, а на тое, як вывучаць. Калі адоранаму дзіцяці прадастаўлена магчымасць не спяшацца з выкананнем задачы і не пераскокваць з аднаго на другое, ён найлепшым чынам спасцігне таямніцу сувязі паміж з'явамі і навучыцца прымяняць свае адкрыцці на практыцы. Неабмежаваныя магчымасці аналізаваць выказаныя ідэі і здагадкі, глыбока ўнікаць у сутнасць праблем

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спрыяюць прыроднай дапытлівасці, аналітычнаму і крытычнаму мысленню [3, с. 76–81]. На наш погляд, усім гэтым умовам цалкам адпавядае сацыяльна-культурная дзейнасць.

Аналізуючы дзейнасць сучасных вучэбна-выхаваўчых і адпачынкавых установ, можна вызначыць наступныя асноўныя кірункі арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці з адоранымі дзецьмі.

– Адукацыйная дзейнасць, якая накіравана на атрыманне пачатковых навыкаў прафесіі або мастацкага майстэрства. Да гэтага напрамку можна аднесці: заняткі ў гуртках, студыях, трэнінгі, кансультацыі.

Вядома, адной з праблем развіцця адораных дзяцей з'яўляецца тое, што існуючыя адукацыйныя мадэлі акцэнтуюць сваю ўвагу толькі на адным складніку фарміравання адоранай асобы, і гэта прыводзіць да нераўнамернага развіцця дзіцяці, яго здольнасцей. Адной з форм сацыяльна-культурнай дзейнасці, якая можа рашыць гэту праблему, з'яўляецца гурток. Гурток – гэта папулярная форма арганізацыі вольнага часу, якая выкарыстоўваецца як для рознабаковай культурнай асветы дзяцей, так і ў мэтах развіцця мастацкіх, навукова-тэхнічных, арганізацыйных здольнасцей, уменняў і навыкаў у сферы адпачынку. Да асноўных характарыстык гуртковай працы адносяцца: параўнальна невялікі склад удзельнікаў, групавы характар дзейнасці, наяўнасць агульнай мэты і агульных інтарэсаў, што дазваляе ствараць умовы для ўсебаковага развіцця здольнасцей адораных дзяцей.

– Гульнёвая дасугавая дзейнасць, якая разумеецца як актыўны адпачынак у гульнёвай форме, накіравана на пашырэнне кругагляду дзяцей і арганізацыю іх вольнага часу. Часцей за ўсё гэта конкурсы, віктарыны, гульнёвыя праграмы, ранішнікі і інш. Да такіх формаў таксама адносіцца арганізацыя і правядзенне культурна-адпачынкавых праграм. Увогуле, культурна-адпачынкавая праграма – гэта зманціраваны разам комплекс разнастайных элементаў, сярод якіх можна вылучыць танцавальныя блокі, гульні, сустрэчы з цікавымі людзьмі, канцэртныя нумары і многае іншае. У межах працы з адоранымі дзецьмі культурна-адпачынкавая праграма выступае як механізм, з дапамогай якога можна развіваць здольнасці адораных дзяцей, узбагачаць іх веды, акрамя таго, такія праграмы заклікаць ажыццяўляць выхаваўчую функцыю, выпускаючы дзіцяці ў праблемнае поле праграмы, мы даём яму магчымасць самастойна прымаць рашэнне па выхаду з той ці іншай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сітуацыі і інш. Можна сустрэць наступныя віды такіх праграм: пазнавальна-забаўляльныя (конкурс, віктарына, інтэлектуальная гульня); святочныя гістарычныя (літаратурна-музычныя кампазіцыі да памятных дат, канцэртныя праграмы і інш); танцавальна-гульнёвыя (вечар адпачынку, тэматычная дыскатэка); фальклорныя (абрадавыя святы) і інш.

– Рэкрэатыўны вольны час накіраваны на пераключэнне ўвагі дзяцей і адпачынак іх ад урокаў у школе, зносіны, азнаямленне з прыродай і культурнымі каштоўнасцямі. Гэтым мэтам адпавядаюць паходы, экскурсіі, клубы па інтарэсах і інш.

Экскурсія разглядаецца як калектыўнае наведванне музея, выставы; паездка, прагулка з адукацыйнай, навуковай, спартыўнай ці забаўляльнай мэтай. Улічваючы асаблівасці светаўспрымання адораных дзяцей, лепей ператвараць экскурсію ў святочную прагулку і арганізаваць справу такім чынам, каб экскурсанты маглі набыць карысную інфармацыю, абмяняцца поглядамі на ўбачанае і пачутае, адпачыць маральна і фізічна, прыдбаць зарад энергіі і аптымізму.

– Праца з бацькамі адораных дзяцей уключае стварэнне ўмоў для прыцягнення сям’і да суправаджэння дзіцяці; асвету і кансультаванне па актуальных праблемах дзяцей (гутаркі, сустрэчы, «круглыя сталы»); кансультаванне па пытаннях зносін дзеці–бацькі па запыце бацькоў і інш. [1, с. 52].

Дадзены пералік формаў арганізацыі вольнага часу адораных дзяцей з’яўляецца далёка не поўным. На сучасным этапе развіцця сацыяльна-культурнай дзейнасці адораных дзяцей усё часцей атрымліваюць распаўсюд такія ж формы, як трэнінгі, канферэнцыі, практыкумы і інш. Зыходзячы з усяго вышэйсказанага, мы можам заключыць, што сацыякультурная дзейнасць валодае сапраўды багатым патэнцыялам у рабоце з адоранымі дзецьмі і павінна стаць часткай сацыяльнага часу адораных дзяцей, якая выкарыстоўваецца для захавання, аднаўлення, развіцця фізічнага і духоўнага іх здароўя, іх інтэлектуальнага ўдасканалення.

1. *Ничишина, Т. В.* Основы социально-педагогической работы с одаренными детьми / Т. В. Ничишина. – Брест: БрГУ, 2006. – 109 с.

2. *Социально-культурная* деятельность: теория, технологии, практика: кол. монография / ред.-сост. Л. Е. Осипова; науч. ред. В. Я. Рушанин; Челяб. гос. академия культуры и искусств. – Челябинск: [б.и.], 2005. – 280 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Юркевич, В. С.* Одаренный ребенок: иллюзии и реальность: книга для учителей и родителей / В. С. Юркевич. – М.: Просвещение, 1996. – 136 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ